Сяргей Астравец



...пра каўтун марылі ўсе,
нават апазіцыя, толькі не прызнавалася...

# Каўтун

***Неверагоднае апавяданьне***

*Каўтун — наш крыж,*
*Каўтун — наш гонар,*
*Каўтун — наш сьцяг,*
*які вядзе ўпярод.*

Кожная краіна мае свае адметнасьці. У адной мужчыны носяць чалмы, а жанчыны паранджу, у іншых любяць самбрэра або цюбяцейкі. Галовы аздабляюць шыньёнамі, парыкамі, пучкамі пер'яў, робяць процьму касічак, заплятаюць у іх стужкі, пацеркі. А ў нас ёсьць каўтуны. З летапісу вядома, што першы наш князь меў гэтую рэч у сябе на галаве. Жыцьцё было цяжкае, вакол дрыгва, багна, твань, і гэтым усё тлумачыцца. Мыла не было зусім. Княская дружына з каўтунамі выглядала, як

індзейцы з пер’ем на галовах. Наводзіла жах дружына княская. Застаючыся ў памяці ворагаў менавіта сваімі каўтунамі, якіх ня мела ніякае іншае войска.

Вядомыя гравюры кніжныя з тутэйшымі жыхарамі, у кожнага каўтун, і подпіс лацінскі *kovtuns abyknaveny*. Князь сьцінаў каўтуны ваярам, якія збаяліся або папросту ня здолелі выканаць баявы загад. Найвышэйшая ганьба — некаторыя скончалі самагубствам, як самураі. Шляхетны звычай.

Сёньня пачалося адраджэньне традыцыяў, вяртаньне да першакрыніцаў, да падставовых вартасьцяў. Культываваньне нацыянальных асаблівасьцяў летапісных. Усё таму, што нашыя папярэднікі развучыліся весьці за сабой слушнай дарогай, самі страцілі перакананасьць, страцілі аргументы.

— Што гэта ў вас каўтун зьмяўся, ня выспаліся, ці што? — цікавіўся на ранішнім пасяджэньні старшыня ўраду Кабяк. — Трэба сачыць за сабой, за сваім выглядам, народ па гэтым мяркуе аб стане ўлады. Калі мы ўсе з памятымі або з лахматымі каўтунамі будзем сядзець у тэлевізары, што пра нас падумаюць у цывілізаваным сьвеце?..

Каўтун, як ні дзіўна, падабаўся ня ўсім. Былі ворагі нават, якія змагаліся супраць каўтуна, за еўрапейскі выгляд і гігіену. Нарфронт абвясьціў здрадніцкі лозунг — «Без каўтуна — у Эўропу!» На дэманстрацыях трымалі галоўным чынам транспаранты «Каўтун — гэта ганьба!».

Усё тое адбывалася шмат у чым праз неразуменьне народных патрэбаў. Народу падабалася з каўтунамі. Апазіцыя прапагандавала мыла і шампунь заходніх рэкламных гатункаў. Народ жа папросту ненавідзеў тэлерэкламу, якая перашкаджала глядзець кіно. Афіцыйная прапаганда папулярна тлумачыла: часта мыцца — чужая, заходніцкая звычка.

Народу падабалася ўпарадкаваная іерархічнасьць. Агульнадзяржаўным каўтуном узнагароджваў старшыня ўраду. Ніжэйшыя ўлады мелі свае ганаровыя граматы і каўтуны — меншыя памерамі — адпаведна чым меншай была ўлада: выканкам губернскі, павятовы, сельвыканкам.

Каб нікому не рабілася крыўдна, у краіне былі розныя прафесійныя сьвяты. Ня толькі Дзень працаўнікоў, напрыклад, сельскай гаспадаркі або машынабудаваньня, а нават — Дзень архіварыуса або Дзень вахцёраў і стралкоў ВОХР і шмат іншых. Амаль кожны дзень кагосьці ўзнагароджвалі. Было і асобнае сьвята — Дзень каўтуна, асабліва любімае народам. У траўні, адразу пасьля Дня перамогі над ворагамі. На агульнадзяржаўных дажынках каўтуны выдавалі героям жніва — камбайнёрам. Ганаровыя каўтуны даставаліся замежным гасьцям і палітыкам, зрэшты нешматлікім, якія яшчэ сябравалі з Краінай Каўтуноў. Пуцяцін, Жырноў, Суцін, Баймурадаў, Манонаў, Аман-баша, Чумак Башкіравіч.

Апазіцыя і ўсе нядобранадзейныя — валацугі розныя засталіся без каўтуноў. Шум усчаўся. Аб правох чалавека. Людзі двух гатункаў! Прадуктовыя карткі горшыя і гэтак далей. Забыліся, што каўтун яшчэ трэба заслужыць. Звычайным грамадзянам таксама ня ўсім давалі. У войску — адно элітным аддзелам. Амонаўцам. Ім прыдумалі жалезныя будзёнаўкі, каб захоўваліся каўтуны. Крыху нагадвалі ку-клукс-кланцаў. Супрацоўнікам дзяржбясьпекі выдавалі каўтуны пагалоўна. Яны мусілі хадзіць заўжды ў шапках, нават у сьпёку, каб не вылучацца.

У кабінеце міністраў наяўнасьць каўтуноў таксама была ўсеагульнай. Урадавая рэспубліка — такая існавала форма кіраваньня, як завяшчаў Каліноўскі. Па трэцім варыянце новай канстытуцыі. Без парламенту, як, па сутнасьці, лішняга воргану. Накшталт рудыментальнага, ад якога ніякай карысьці, як ад копчыка, які зьяўляецца рэшткамі нашага хваста. Князь Каўтун таксама некалі веча разагнаў, і адразу настаў парадак. Пра гэта пісалася ў Тураўскім летапісе, які, на жаль, не захаваўся.

Затое можна пачытаць Сагу аб дружыне княскай. На Нямізе адбываецца крывавае жніво. Каўтуны сьцінаюць, як калосьсе — цэлымі жмутамі, быццам снапы дажынкавыя. Сам Каўтун на той час ужо памёр. Вось такая гісторыя.

Уся сталіца цяпер завешаная аб'яўкамі: купім валасы, не карацейшыя за 32 см. Каўтуны, згодна дзяржстандарту, павінны быць натуральныя. Першы каўтун выдаецца бясплатна. Але можа змокнуць, зьлямчыцца, таму запасныя — у продажы. Купіць можна толькі па дакументах. Спыніць патруль на вуліцы і спраўдзіць тваё пасьведчаньне. Падробныя трапляюцца. Тады — 15 сутак або штраф — 100 мінімалак.

Ды што просты народ, модніцы пачалі ў падпольных цырульнях заплятаць валасы ў каўтуны, шапкі на іх заказваць у Доме модаў Сашы Салманава. Пра каўтун марылі ўсе, нават апазіцыя, толькі не прызнавалася. Цэлая індустрыя ўзьнікла — сьпецшампуні, лакі, хімчыстка: «Каўтуны, старэйшыя за 10 гадоў і неразабруджаныя — не прымаюцца!». Каўтун зрабіўся ладам жыцьця.

— Таварышы міністры, — працягваў урадавае пасяджэньне прэм'ер, — штосьці мне не падабаецца ваш зьнешні выгляд. Каўтуны павесілі, прабачце, як насы. Весялей трэба, больш аптымізму! Вось паглядзіце, які ў мяне каўтун. Як агурок. Мне ж ня жонка яго натапырвае, сам. А то гальштук жонка завяжы, кашулю папрасуй, чаравікі каб блішчэлі таксама. Сорамна, гаспада міністры! Так справа ня пойдзе. Ну вось вы, Раздрай Раздраевіч.

— Раздракавіч.

— Ну, прабачце. Чаму ваш каўтун нейкі млявы?

— Пад дождж трапіў, калі з машыны выходзіў.

— Пад дождж. А для чаго я ўсім членам кабінету футраныя

цыліндры пашыў? З бабра. Насіць трэба, а то моль паб’е.

— Жарка цяпер у ім.

— Жарка яму! Я ў цыліндры прама заляцеў у Арабскія Эміраты. Вось там сапраўды. І нічога, не сапрэў. А як узьбекі ходзяць у папахах, вачэй не відно? Казьбек Узьбекавіч, раскажы яму, каб не баяўся цяпла і сонца. Ад пары касьцей ня ломіць. Яшчэ і чай гарачы з піялаў п’юць у папахах сваіх, у кучмах. Сярэднеазіяты. У Кушцы сваёй. Чай, дарэчы, тлусты, з тлушчам авечым. Але вас ніхто не прымушае. У нас чай «Бяседа» — бяседуйце на здароўе!» Можа нам на пасяджэньнях чай піць? Каб больш па-дамашняму было.

— Можна, канешне.

— А які хочаце — байхавы там, зялёны або кітайскі?

— У гранулах некаторыя любяць.

— А ў нас — лепей з доўгім ліcьцем... А каліcьці грузінскі, азербайджанскі, армянскі...

— Армянскага не было, толькі каньячок. Пяць зорачак.

— Ну, добра. Закончым дыскусіі. Паставім самавар і кропка. Электрычны. Двухвядзёрны. Нас тут многа. Вернемся да нашых каўтуноў, пачнем. Таварышы міністры, прашу праверыць свае каўтуны і заправіцца, як у войску гавораць. Неахайнасьці я не пацярплю. Калі ня ўмееш свой каўтун у парадку трымаць, які з цябе міністр? Калі ў цябе на галаве гармідар. Калі на галаве абы-што, дык што ў галаве тады? Якая форма, такі і зьмест. Толькі не крыўдуй, Рамзэс Шыракавіч. Крытыку і сама-крытыку трэба разьвіваць. Трэба заўжды трымаць сябе ў форме. Быццам рыхтуешся на прыём да брытанскай каралевы. Там этыкет — будзь здароў. А то параспускалі сябе, сядзіце за сталом з жыватамі, з пучкамі на галаве — як чыпаліны нейкія. Падзівіцеся на сябе! Часьцей трэба перад люстэркам затрымлівацца. А то пагаліў-ся — і хутчэй за стол. Боршч сёрбаць.

— Няёмка перад жонкай. Мужчыны ўсё-такі.

— Не, ну так ніяк не гадзіцца, мужыкі. Каўтуны зусім не трымаюцца. І гэта ў членаў кабінету. Сорамна!

— Дождж кожны дзень.

— Нашы вучоныя мне далажылі. Новы сродак вынайшлі. Для замацаваньня каўтуноў. Вось наладзім прамысловую вытворчасьць — каб усе прыдбалі, а то несалідна перад рабочымі, калі міністрам — усё забясплатна. Давайце паслухаем справаздачу з каўтуннай фабрыкі. Што там з планам, гарыць? Кінь ты гэтыя парыкі, Хазбулат Уралавіч, пачакаюць. Каўтуны трэба. Больш і лепшай якасьці. Запомніце. А то, што пагорш — камбайнёрам. Ім, маўляў, не фарсіць па сталіцах. І што атрымліваецца? Наадварот! Такія ўмовы працы, што хутка псуецца. Ад пылу, ад поту, сьпёка, дажджы. Часьцей трэба мяняць. Марнатраўства нейкае. У сталіцы мы тут маем лепшую якасьць, можам ашчаджаць. Зноў просты народ пакрыўджаны, хоць і з каўтунамі.

— Не хапае валютных запасаў, каб усім лепшы гатунак.

— Трэба выкручвацца. Напрыклад, спартсмены зарабляюць медалі, прызы. Мы для іх нічога не шкадуем. Нашы спартсмены самыя высокія на Алімпіядах, апроч мурынаў. Там у іх племя цэлае ў Афрыцы ёсьць. Адны кароткія зусім — пігмеі, другія наадварот. Такая катавасія. Бананы з дрэва зрываюць. Як жырафы. Але нашы з каўтунамі ўсё роўна сімпатычней глядзяцца.

— У мяне, таварыш прэм'ер, будзе зараз паведамленьне. У калгасе імя Парамон Парамоныча прыцягнулі народных умельцаў каўтуны рабіць з ільну...

Пасяджэньне трансьлявалася праз радыёкропку дзеля пашырэньня публічнасьці і дэмакратызацыі жыцьця ў краіне.

— Што вы каўтунамі варушыце? Мазгамі трэба варушыць.

— Каўтуны добра не стаяць, радыяцыя сказваецца.

— Усё вам перашкаджае, як кепскаму танцору. Трэба даглядаць іх, пудрыць. Увогуле, запасныя каўтуны трэба мець пры сабе — дождж там ці яшчэ што здарыцца. Футаралы існуюць сьпецыяльныя. Не эканомце! Несалідна!

— Народ незадаволены. Як раней, гаворань, шчэць і шкуру кабаноў забіралі ў калгасьнікаў, цяпер валасы ў цырульнях — каб абавязкова.

— Гэта камерсанты-сьпекулянты толькі могуць абурацца, што ім перашкаджаюць нячэсныя грошы нажываць. Ніхто з іх ня мае каўтуна свайго, дык хоць нажыцца рукі сьвярбяць. Тут манаполія павінна быць дзяржаўная, як на гарэлку. Стратэгічны тавар. Каўтун яшчэ трэба зарабіць. Гэта ня проста так, гэта не прывілей перш за ўсё, перш за ўсё гэта — абавязак. Трэба апраўдваць давер. А ня проста начапіў і фарсіць толькі. Фарсуны нам тут не патрэбны. Тут у нас кабінет міністраў, хачу гэта напомніць, хто забыўся. Таму трэба работаць, працаваць і дбаць пра свой зьнешні выгляд. Штохвілінна і штогадзінна. З каўтуном сваім трэба любоўна. Абыходзіцца, як з дарагой рэччу. Трэба несьці свой каўтун з гонарам праз жыцьцё, каб ня стала потым пакутна, сорамна і балюча за бязмэтна пражытыя гады. За свой зьбэшчаны каўтун...

Раптам міністры паўскоквалі, з вуліцы пачуўся стукат і звон. Кінуліся да вокнаў, пачалі расчыняць. З высокай і вялікай статуі Парамон Парамоныча, якая стаяла перад Домам ураду, зваліўся на брук бронзавы каўтун...

Праз расчыненыя вокны пачуліся нейкія архаічныя гукі. Пошчак капытоў. Ці конны Амон у жалезных будзёнаўках. Ці княская дружына.

*25-26 сакавіка 2000 г.*